# АДРАСАВАНА ЎСЕСАЮЗНАМУ ЧЫТАЧУ

Дзяржаўная бібліятэка СССР імя У. І. Леніна даўно рыхтуе сумесна з дзяржаўнымі бібліятэкамі саюзных рэспублік бібліяграфічныя даведнікі па літаратурах народаў СССР, адрасаваныя выкладчыкам, студэнтам, лектарам, прапагандыстам, усім, хто цікавіцца гісторыяй і сённяшнім станам савецкай шматнацыянальнай літаратуры. Чарговы зборнік у гэтай серыі — «Беларуская літаратура». Ён падрыхтаваны масквічамі разам з Дзяржаўнай бібліятэкай БССР імя У. І. Леніна (аўтарыскладальнікі Н. Ватацы, М. Каваленка, Р. Сіпакова) і выпушчаны летась выдавецтвам «Кніжная палата».

Доктар філалагічных навук М. Мушынскі ва ўступе прасочвае асноўныя этапы развіцця беларускай літаратуры. У завяршальным раздзеле называюцца кнігі, артыкулы, якія дапаўняюць гэтыя звесткі, даюць уяўленне аб сувязях беларускай літаратуры з іншымі літаратурамі, дазваляюць адчуць яе месца ў кантэксце савецкай шматнацыянальнай літаратуры.

У даведніку два асноўныя раздзелы — «Дакастрычніцкая літаратура» і «Савецкая літаратура». У абодвух названы 56 пісьменнікаў, а таксама ананімная паэма «Тарас на Парнасе». Змешчаны партрэты аўтараў, бібліяграфічныя звесткі пра іх, агляд асноўных твораў і іх спіс у перакладзе на рускай мове, спіс літаратуразнаўчых і крытычных работ па творчасці пісьменнікаў.

М. ВАСІЛЬЧАНКА.